ARCHE 1 (10) ’2001

**Скарына**

**аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі**




# Зьмест

Юрась Лаўрык

## Найбольшае інтэлектуальнае ашуканства

„Калісьці, падлеткамі, мы зь сябрамі часам пакеплівалі з чыйгосьці прэтэнцыёзнага маўленьня фразай: „З пункту гледжаньня банальнай эрудыцыі ніводзін здаровадумны індывідуум ня ў стане ігнараваць тэндэнцыі парадаксальных эмоцыяў“. Тады нам гэты сказ здаваўся вяршыняй непатрэбнай надуманасьці ды завумнасьці…“

Валерка Булгакаў

## Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму

„Перад намі парадаксальная сытуацыя: набыцьцё Беларусяй незалежнасьці напачатку толькі аддаліла Беларусь ад Эўропы. Наколькі зацягнецца гэтая камунікацыйная паўза, залежыць ня толькі ад палітычных, але і ад…“

Зьбігнеў Бжазінскі

## Жыцьцё з новай Эўропай

„Эўраатлянтычны альянс для Амэрыкі — найважнейшы глябальны хаўрус. Гэта трамплін для актыўнасьці Амэрыкі ў сьвеце, які дае ёй магчымасьць выступаць у ролі арбітра ў Эўразіі — геапалітычна цэнтральным рэгіёне сьвету; гэта і кааліцыя, якая ў сусьветным маштабе дамінуе ўва ўсіх ключавых сфэрах улады і ўплыву. Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці і стаецца рухавіком сусьветнае эканомікі й базай для…“

Вінцэсь Мудроў

## Пошукі радзімы

„Кожны раз увесну, калі прылятаюць птушкі і высокае неба скаланаецца ад птушынага граю, калі ў гарадзкіх парках і на гародах паляць зімовае сьмецьце і жоўтыя лапы дыму цягнуцца, нібыта кітайскія цмокі, да дрыготка-зьвінючага сонца, памяць мая абуджаецца, і я вяртаюся ў тую далёкую, невядома якога году вясну…“

Карл Шлёгель

## Кіёск Эўразія, альбо Бэрлін як пэрспэктыва і цэнтар

„…Усе ведаюць пра Бэрлінска-Варшаўскую нізіну, але мала хто ведае пра *Metropolitan Corridor*, у якім таксама знаходзіцца Бэрлін. Калі глядзець звонку, ён ідзе з захаду на ўсход і расьцягваецца больш як на дзьве тысячы кілямэтраў. Ягоныя найважнейшыя станцыі — Бэрлін—Познань—Варшава—Берасьце—Менск—Смаленск—Масква…“

**Дэн Якабсан**

## Літоўская пастараль

„Няма такога іншага падманліва-нявіннага краявіду, як літоўскі. Я наведаў краіну ў чэрвені, калі лета ў самай сіле і літаральна ўсюды буяе расьліннасьць. Аднак незвычайнае ўражаньне даверлівасьці й адкрытасьці, характэрнае для літоўскага краявіду, стваралася ня гэтым...“

**Юры Андруховіч**

## Час і месца, альбо Мая апошняя тэрыторыя

„...Я жыву ў спакон вякоў падазронай і зняважанай частцы свету. Гэтая частка свету называецца Галіччынаю. Магчыма, таму мне не застаецца нічога іншага, як назваць сябе постмадэрністам. Гэта, безумоўна, жарт, але не надта вясёлы.
Ёсць рэгёны праўдзівыя, цэласныя нават у сваёй зруйнаванасці ды пачварнасці. Галіччына — наскрозь штучная, сшытая ў цэлае белымі ніткамі псеўдагістарычных домыслаў і палітыканскіх інтрыг...“

**Андрэй Дынько**

## Resistant Culture

„...Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у сьвеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах „польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадвае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах „дацкая культура“ — Мунка і Андэрсэна. Пры словах „беларуская культура“ масквіч узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту „Песьняры“...“

## Сто беларускіх кніг XX ст.

Паводле апытаньня чытачоў газэты „Наша Ніва“

**Юрась Пацюпа**

## Мэзальянсы, або Юрлівыя санэты

„Кожны, хто закаханы ў санэт, ведае, што гэта найбольш складаная, дасканалая і выкшталцоная форма вершу. Але мала хто задумваецца над тым, што санэт паводле свае прыроды і найпарадаксальнейшы жанр. Эстэтычныя рэчы, супраць этычных, як ведама, імкнуцца да разнастайнасьці. Санэт жа, наадварот, у самой сваёй існасьці абапіраецца на норму.
І невыпадкова першым аўтарам санэту быў натарыюс. Як жа ў такім разе ён спраўджвае сваё эстэтычнае наканаваньне?...“